**В.А. Максімовіч (Мінск)**

## Класіка ў сацыякультурнай прасторы сучаснасці

Класіка складае залаты фонд кожнай нацыянальнай літаратуры. Яна – аб’ектыўна – пазначае магістральныя кірункі станаўлення літаратуры, фарміруе яе непаўторнае аблічча, вызначае дамінанты і вектары развіцця мастацкага слова, сканцэнтраваўшы ў сабе ўсе шматстайныя праявы нацыянальнай духоўнасці. Як, зрэшты, і кожная высокамастацкая з'ява, яна пранізана трывожным болем і хваляваннем за лёс чалавека і чалавецтва, яна нясе пазітыўны зарад, сцвярджае ў жыцці людзей гуманістычныя каштоўнасці. І гэта – бясспрэчная аксіяматычная ісціна, якая праверана часам, самім жыццём. Яе праўдзяць і прызнаныя карыфеі сусветнага і нацыянальнага мастацкага летапісу жыцця народа. Іх творы пазначаны нязменна высокім пафасам грамадзянскасці, гуманізму, маштабным ахопам шматстайных і поліфанічных праяў рэчаіснасці. У самаадданым, ахвярным служэнні высокаму мастацтву яны бачаць сваё сапраўднае прызначэнне, сваю пачэсную місію. І нават з дыстанцыі часу, ужо з улікам іншай сацыякультурнай сітуацыі і проста жыццёвага досведу мы наноў спасцігаем глыбінную духоўную сутнасць нашай літаратурнай класікі, не прамінаючы падкрэсліць яе выключна важную ролю ў сцвярджэнні гуманістычных прыярытэтаў і агульначалавечых маральна-этычных каштоўнасцей.

Неацэнная роля нацыянальнай класічнай спадчыны – у вырашэнні праблемы гістарычнай кадыфікацыі нацыі, вызначэнні яе сутнасных параметраў у мэтах далейшага і канчатковага сцвярджэння ў Сусвеце. Поруч са спасціжэннем духоўнага вобліку народа менавіта класічная слова здольнае дзейсна ўплываць на працэс асобасна-індывідуальнай самаідэнтыфікацыі, саматоеснасці як важных чыннікаў грамадзянскага станаўлення. Не менш важны, калі не асновасутнасны, складнік класікі – вынаходніцтва адметных формаў мастацкага спасціжэння духоўнага абсалюту як моцнага супрацьдзеючага фактару ў дачыненні да разбуральных, хаатычных і дэструктыўных грамадскіх працэсаў.

Колькі б мы ні гаварылі пра пошукі літаратурай новых падыходаў да асэнсавання і спасціжэння складаных, неадназначных праблем ужо нашай сучаснасці, пра выпрацоўку адпаведных часу мастацкіх форм і спосабаў пазнання і адлюстравання рэчаіснасці, усё адно не можам праігнараваць, адкінуць, занядбаць жыватворную сілу класікі як аснову высокай духоўнасці, як эталон чалавекалюбных, дабратворных і спагадлівых адносін да жыцця. Сучаснай літаратуры, як пэўна структураванай і самаарганізаванай сістэме, міжволі наканавана звяртацца да замацаванай цягам доўгага часу нацыянальнай традыцыі, калі яна хоча застацца ўплывовым фактарам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

грамадскай свядомасці, істотным складнікам нацыянальнага жыцця. Іншая рэч, што, «дзякуючы» постмадэрнісцкім штукарствам, насуперак здароваму сэнсу падобны зварот часам адбываецца паводле дэструктыўнай мадэлі. Не варта, думаецца, у гэтай сувязі лішні раз гаварыць пра, мякка кажучы, выклікаючыя пярэчанне шмат якія мадэрныя ілжээстэтычныя знаходкі і інавацыі, пра тую негатыўную, прама скажам, небяспечную, а то і адкрыта згубную інтэнцыю – ператварыць слова ў зброю разбэшчання, атручання чалавечай душы, па-езуіцку выкарыстаць яго ў якасці сродку дэвальвацыі хрысціянскіх прынцыпаў этыкі, дабрачыннасці і гуманізму.

На вялікі жаль, ва ўмовах нарастання сістэмнага крызісу, пераацэнкі і дэвальвацыі духоўных каштоўнасцей, літаратура апынулася ў няпростай сітуацыі. Больш за тое, даводзіцца прызнаць: мастацкае слова спакваля страчвае сваю ствaральную, пазітыўна-дзейсную функцыю. Негатыўныя наступствы гэтага не могуць не выклікаць непакой і насцярогу, бо закранаюць – без перабольшання – тонкія ментальныя асновы жыццеўладкавання, пачуццёва-эмацыянальнае самапачуванне асобы, падрываюць этычныя каштоўнасці, разбуральна ўздзейнічаюць на свядомасць і фарміраванне мастацкага густу чытача. Усё гэта, у сваю чаргу, негатыўна адбіваецца на грамадскім клімаце, на самім працэсе зберажэння і ўмацавання нацыянальнай традыцыі, якая заключае ў сабе, у ліку астатніх, родавыя, сямейныя, крэўныя сувязі. Даводзіцца пагадзіцца з тым, што адбываецца татальная дэканструкцыя не толькі літаратуры, але і базісных прынцыпаў нацыянальнай свядомасці. Больш за тое, у сусветным маштабе пытанне тычыцца захавання ўстойлівасці, стабільнасці асноў самой цывілізацыі, уласна, жыцця на зямлі. Па сутнасці, размова ідзе пра маючы адбыцца, калі паддацца інертнасці і абыякавасці, *псіхалагічны* катаклізм, праявы якога можна назіраюць у валюнтарысцкім навязванні стэрэатыпу агрэсіўных, ледзь не дзікунскіх паводзін, у алгарытме дыскрэтнага мыслення, што вядзе да непрадказальнасці дзеянняў і учынкаў. Усё менш становіцца у пашане кодэкс маралі, ігнаруюцца біблейскія запаведзі, фундаментальныя, жыццятворныя прынцыпы гуманізму, дабра і справядлівасці.

Пры выбары шляхоў вырашэня складаных жыццёвых задач класічнае мастацкае слова заклікана дапамагчы захаваць духоўную ўстойлівасць і ўпэўненасць у пераадоленні цяжкасцей і перашкод. З глыбокім усведамленнем эстэтычных задач, якія стаялі перад літаратурай, шырока і ўсеабдымна раскрываў разнастайныя праявы нацыянальнай рэчаіснасці Я. Колас. Галоўнай мастацкай вартасцю паэзіі Коласа з'яўляецца яе існая народнасць, дэмакратызм. Ступень і характар паэтызацыі родных краявідаў, пейзажныя замалёўкі, прыродаапісальная лірыка паэта ў цэлым – з разраду

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з’яў неардынарных, якія істотна ўплывалі на станаўленне асноў нацыянальнай літаратуры, на ўмацаванне нацыянальнай традыцыі, ідэалагічна-эстэтычнай нарматыўнасці. Нароўні з Купалам Колас актыўна ўдзельнічаў у працэсе канструявання знешняй карціны нацыянальнага свету і нацыянальнага тыпа беларуса, дасягаючы высокага сплаву універсальнага і нацыянальнага пачатку. Валодаючы надзвычайнай цэласнасцю светаадчування, паэт у многіх вершах па-мастацку выяўленча-пластычна паказвае стыхійна-жыццёвыя асновы рэчаіснасці з тонкай нюансіроўкай псіхалагічнага стану свайго лірычнага героя.

І менавіта такія складнікі паэтычнага стылю Коласа, як нацыянальны паэтызм (экзатызм) надалі яму асобую афарбоўку, процілеглую еўрапейскаму касмапалітычнаму эскапізму,ператварыліся ў своеасаблівыя эстэтычныя катэгорыі, закліканыя выразіць глыбокі нацыянальны дух літаратуры. Менавіта ў Коласа пейзаж з катэгорыі геаграфічнай пераходзіць у катэгорыю гістарычную і духоўную. Паралельна ён заглыбляў, адцяняў і індывідуальны пачатак у літаратуры. І ўсё гэта, разам узятае, станавілася той мяжой, што аддзяляла несправядлівы свет ад ідэалізаванага і ўтапічнага, становячыся апошнім. Яўнае, відавочнае, сацыяльна заангажаванае станавілася сапраўдным толькі праз прызму ідэалізацыі свету. Своеасаблівы паэтычны экзатызм, як ён выявіўся ў пейзажнай лірыцы таго часу (найперш у паэтычнай прасодыі Я. Коласа), стаў праявай тыпова рамантычнага ўтапізму, формай асэнсавання ўласна нацыянальна-культурнага быцця праз самое сябе. Гэта тычыцца і больш буйных эпічных рэчаў, такіх, як, прыкладам, “Яна і я” Я. Купалы і “Новая зямля” Я. Коласа. Паняцце “новая зямля”, з аднаго боку, сваёй няпэўнасцю ўказвае на незавершанасць і незакончанасць самаідэнтыфікацыі беларускага этнасу ў плане поўнага ўсведамлення ім сваёй нацыянальнай адметнасці (усяго толькі “новая зямля” (безназоўны мацярык) – “terra incognita”, – а не канкрэтна-гістарычны рэгіён – Беларусь)[1], і, разам з тым, падспудна скіроўвае ўвагу на распазнанне і спасціжэнне гэтага неспазнанага “мацерыка”. Я. Колас супрацьпаставіў песімістычным пазітывісцка-натуралістычным вобразам роднага краю і беларускага мужыка іншы – апалагетычны вобраз Новай Зямлі ў духу неаязычніцтва, абагаўлення прыроды, нацыянальна-цывілізацыйнага ўтапізму. Міфалогія, гісторыя Беларусі (= Новай Зямлі) паўстае тут як роўнавялікая з сусветнай культурай традыцыя-міфалагема, якая пераканаўча

---

[1] У якасці адваротнага прыкладу можна прывесці паэму А. Міцкевіча “Пан Тадэвуш”, дзе паняцці Літва, літоўскі выразна падкрэсліваюцца і выдзяляюцца як пэўная геаграфічная, гістарычная і дзяржаўная канкрэтнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адкрывае свету вабнасць, прыцягальнасць і красу гэтай зямлі, сапраўды новай у плане яе духоўна-сакраментальнага спасціжэння.

Клічучы наперад, Колас клікаў назад, у прыроду, у гармонію космасу, дзе голас чалавека і голас прыроды зліваюцца ў агульным рытме сэрцабіцця сусвету. Ідэя "адзінства свету, спрадвечна і бясконца няспыннага жыцця, роднасці ўсяго і ўся" [1, с. 35] сугучная з народна-эстэтычнымі, міфа-фальклорнымі ўяўленням аб прыродзе. Анімістычны погляд на жыццё, пантэістычнае ўспрыманне свету, паўсюдная эстэтызацыя з'яў навакольнай прыроды – усё гэта ішло ад народнага, "дагістарычнага" сузірання, але і ў не меншай ступені – ад самой гістарычнай эпохі, якая па-новаму пераасэнсоўвала, трансфармавала народны міфапаэтычны субстрат. Міфапаэтычны арэол быў прыўзняты на новы светапоглядны ўзровень, на ўзровень мастацкага спараджэння новай рэальнасці. Адухаўленне прыроды, уласцівае народнаму светапогляду, становіцца не роўнай сабе, а неабходна і абавязкова спалучана з сацыяльным і, больш за тое, ідэйна-змястоўным эквівалентам. Нездарма У. Конан называе "Новую зямлю" не інакш, як эстэтычнай экзістэнцыяй беларуса (бескарыслівым успрыманнем свайго быцця) [2. с. 42].

Сутнасна важна было згуртавацца дзеля "вялікаснай і справядлівай, гістарычна выпакутаванай ідэі нацыянальнай незалежнасці Беларусі". "Каб сцвердзіць, узвялічыць і абгрунтаваць гэтую ідэю, – заўважае І. Багдановіч, – Купала паэтызаваў гістарычнае мінулае, у якім бачыў духоўную апору на новым этапе барацьбы. Для гэтага патрэбна была яго гераізацыя і ідэалізацыя" [3, с. 13]. І гэта тычыцца, зразумела, не толькі мастацкай рэфлексіі мінулага. Прыхільнік і прадаўжальнік міцкевічаўскага рамантычнага ідэалу свабоды, рамантычнага пафасу ўвогуле, Купала не паказваў свайго героя выключна як істоту сацыяльна і грамадска ангажаваную, а імкнуўся раскрыць багаты ўнутраны свет сучасніка ў яго бясконцай складанасці. Мужык як прадстаўнік народа выступае ў яго носьбітам, з аднаго боку, інертнасці, непераборлівасці, пакорлівасці лёсу, а з другога – духоўнасці, прыгажосці, свабоды, абуджэння духу ўвогуле. Купала існа адчуваў сябе "пакліканым на новае фармуляванне нацыянальнай ідэі, <...> рашуча адмятаў вобраз бяздольніка-недарэкі і замацоўваў у свядомасці з'яўленне новага годнага, "думнага" сына вялікай краіны. Адпаведна канцэпцыя гістарычнага ўпадку замянялася канцэпцыяй новай, маладой Беларусі, якая творыць сваю адроджаную ўсябытнасць" [4, с. 32]. Гэта азначала, што паэт тым самым публічна абвяшчаў духоўную суверэннасць мужыка як нацыянальнага тыпу, далучаў звычайнага прадстаўніка народа да сучаснай яму цывілізацыі, да культуры, да вышэйшых ідэальных, гуманістычных каштоўнасцей. Менавіта гэты вобраз як бы імпліцытна ўказваў на складанае перапляценне ў ім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

усеагульнага, нацыянальна-гістарычнага і індывідуальнага пачаткаў, на яго гістарычную запатрабаванасць падчас лёсавызначальных грамадскіх падзей.

Гістарычны вопыт канструявання культурна-ідэнтыфікацыйнага асяроддзя дазваляе аддаць належнае тым каштоўнасна-светапоглядным канстантам, якія пазітыўна ўплываюць на працэс самапазіцыявання суб’екта, на ўсведамленне сябе самастойным суб’ектам узаемаадносін і ўзаемадзеяння ў сістэме культурна-цывілізацыйнай рэальнасці.

У зломным свеце, у якім усё больш павялічваецца шчыліна разлому, толькі праўдзівае і сумленнае слова здольна не дапусціць канчатковага краху, энтрапіі, панавання ілжывых, сурагатных паняццяў, ідэй, перакананняў. Вось чаму такую значнасць набывае сам працэс звароту да мастацкіх і гістарычных архетыпаў як да сувязных памяці, як своеасаблівага проціяддзя ад душэўнай амнезіі, анямення. Гістарычны вопыт пераконвае, што спрычыненасць да агульняпрынятых прынцыпаў і норм, перакананняў і ідэй, якія складаюць аснову, базіс грамадскай структуры, дазваляе сцэментаваць, злучыць у адзінае цэлае розныя часткі сацыяльнага арганізму, кансалідаваць грамадства, актывізаваць працэс нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, а тым самым і дасягнуць духоўнага адзінства.

У сённяшняй няпростай сітуацыі тэхналагізацыі літаратуры, страты ёю першапачатковых функцый (фарміраванне нацыянальнай свядомасці, клопат пра нацыянальны лёс, пошукі сэнсу існавання (асабістага і агульналюдскога), калі ідзе працэс актыўнага адмаўлення класічнага канона на карысць г. зв. літаратурнага поліцэнтрызму, вярнуць літаратуры ранейшыя функцыі – быць люстрам грамадскай свядомасці, культываваць прынцыпы хрысціянскай маралі – задача і архіважная, і архіскладаная. Адно пэўна: не павінна быць літаратуры, якая абслугоўвае самую сябе, якая заклапочана толькі сваёй спажывецка-камерцыйнай «самарэалізацыяй». Літаратура – у сваёй галоўнай іпастасі – павінна ажыццяўляць «стратэгію жыцця», сцвярджаць вечныя, абсалютныя ісціны, жыццялюбную канцэпцыю свету і чалавека. Літаратурная класіка і сёння застаецца найважнейшым складнікам стратэгіі забеспячэння духоўнай нацыянальнай бяспекі, адыгрывае незаменную ролю ў сістэме маральна-этычных, эстэтычных і ідэалагічных каштоўнасцей. Яна ўспрымаецца як эталон сапраўднай мастацкасці, артэфактам высокага духоўнага напаўнення. Усе гэтыя якасці варта было б пераняць і развіць у літаратуры XXI ст., якая ў аснове сваёй павінна стаць грунтоўным філасофска-эстэтычным і хрысціянска-гуманістычным летапісам чалавеказнаўства і жыццязнаўства, каб годна спраўджваць сваё высокае прызначэнне.

Літаратура

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Шамякіна, А. Філасофія прыроды – народная і аўтарска-канцэптуальная / А. Шамякіна // Каласавіны. – Мінск , 1998.

2. Конан, У. Цыклічная структура лірыкі: паэзія Якуба Коласа / У. Конан // Роднае слова. – 1996. – № 9.

3. Баргановіч, І. Патрыятычны “неарамантызм” Янкі Купалы ў святле міцкевічаўскай традыцыі і еўрапейскага мадэрнізму / І. Баргановіч // Янка Купала і Адам Міцкевіч: IV Міжнародныя Купалаўскія чытанні (9 верасня 1998). – Мінск , 2000.

4. Баргановіч, І. Метафара маладосці як ідэйна-эстэтычны прынцып мадэрнізму і яго актуалізацыя ў творчасці Янкі Купалы 1910-х гадоў / І. Баргановіч // Нараджэнне класіка: VII Міжнародныя Купалаўскія чытанні – навуковая канферэнцыя. Мінск, 17 – 18 чэрв. 2004 г. – Мінск , 2005.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ